СУЧАСНАЯ ТЭХНІКА, ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

Дзяржаўная дэмаграфічная палітыка

— Наш перынатальны цэнтр — гэта наглядны доказ той дзяржаўнай дэмаграфічнай палітыкі, якая праводзіцца ў Беларусі, — зазначае Людміла Кеда. — Дасягнуты вельмі добрыя вынікі ў службе аховы мацярынства і дзяцінства.

Наша краіна займае 25 месца сярод 179 краін па гарантаванні ўмоў для бяспечнага мацярынства, знаходзіцца на ўзроўні перадавых краін па дзіцячай смяротнасці. З 2000 года ў Гродзенскім перынатальным цэнтры не было выпадкаў мацярынскай смяротнасці.

У Беларусі створана рознаўзроўневая сістэма аказання перынатальнай дапамогі. Увогуле ёсць чатыры ўзроўні. Чацвёрты — рэспубліканскі цэнтр «Маці і дзіця». Трэці — абласныя перынатальныя цэнтры. Другі — міжраённыя цэнтры. І першы — у раёнах.

— Сэнс рознаўзроўневай сістэмы ў тым, што пацыентка, якая мае пэўную паталогію, абавязкова атрымае высокакваліфікаваную дапамогу, — тлумачыць Людміла Кеда. — Чым больш складаная паталогія, тым на больш высокі ўзровень аказання медыцынскай дапамогі яна накіроўваецца. Тое ж тычыцца і нованароджаных, якія пры неабходнасці пераводзяцца ва ўстанову больш высокага ўзроўню.

У тэму

У Гродзенскага перынатальнага цэнтра шмат сяброў (прадпрыемстваў, арганізацый і прыватных асоб), якія аказваюць яму дабрачынную дапамогу. Дзякуючы ёй набываюць неабходнае абсталяванне і матэрыялы, нарыхтоўваюць агародніну, упрыгожваюць будынак і тэрыторыю цэнтра, а таксама ўшаноўваюць падарункамі сваіх пацыентак.

Адметная рыса сучаснага перынатальнага цэнтра — наяўнасць аддзялення дзіцячай рэанімацыі.

— Штогод да 20 дзяцей нараджаецца ў нашым цэнтры з вагой да 1 кілаграма, і мы маем добрыя вынікі іх выходжвання. Нават калі вага, здаралася, складала ўсяго 470 грамаў — расказвае Людміла Мікалаеўна.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Мамы прымаюць віншаванні ад кіраўніцтва Гродзенскага аблвыканкама, рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і адміністрацыі перынатальнага цэнтра.

Пераканацца ў гэтым можна па фатаграфіях, якія змяшчаюць на спецыяльны стэнд у аддзяленні дзіцячай рэанімацыі. Іх па просьбе медыкаў прыносяць бацькі дзетак з праблемнай пры нараджэнні вагой, калі яны падрастаюць. Гэта не толькі пацвярджае якасную медыцынскую дапамогу канкрэтным дзецям, але аказвае станоўчы псіхалагічны эфект на іншых бацькоў.

Тэхнічнае аснашчэнне

Усё гэта дасягнута дзякуючы рэканструкцыі перынатальнага цэнтра з аснашчэннем усім неабходным для аказання кваліфікаванай медыцынскай дапамогі — апаратамі штучнай вентыляцыі лёгкіх, інкубатарамі для нованароджаных, газавымі і гемадынамічнымі маніторамі, апаратамі ўльтрагукавога даследавання, лабараторным і іншым абсталяваннем. Увогуле цяпер задзейнічана каля 400 адзінак тэхнікі, што дазваляе лячыць і абследаваць пацыентаў з прымяненнем найноўшых метадаў і дасягненняў медыцынскай навукі.

— Сваёй задачай бачым удасканаленне медыцынскай дапамогі нованароджаным з малой вагой, каб не толькі выратаваць іх, але і забяспечыць ім добрую якасць жыцця, — кажа Людміла Кеда. — Такія дзеці абследуюцца і калі выяўляецца нейкая паталогія, то ў Гродзенскай абласной дзіцячай бальніцы адразу ж прымяняюцца адпаведныя методыкі лячэння.

Кадравы патэнцыял

Сёння ў Гродзенскім перынатальным цэнтры няма ніводнага кутка, ад падвала да гарышча, які не прывялі ў сучасны выгляд. Пры гэтым імкнуліся зрабіць так, каб кожная жанчына адчувала тут сябе як дома.

— Важна, каб у маладых бацькоў засталіся толькі пазітыўныя ўражанні аб нашай установе, — лічыць Людміла Кеда. — А гэта залежыць і ад добразычлівых адносін з боку персаналу цэнтра, і ад умоў, што створаны для пацыентаў.

Умовы падобныя на санаторныя: тэлевізары ў палатах і холах, прыгожая аддзелка сцен, каляровая бялізна...

Зрэшты, усе гэта было бы другарадным, калі б не высокакваліфікаваныя спецыялісты. Прыкладна 70 % урачоў і больш за палову сярэдняга медыцынскага персаналу перынатальнага цэнтра маюць кваліфікацыйныя катэгорыі.

— Імкнёмся прыўнесці ўсё новае, што ёсць у калег з Беларусі, Расіі, Польшчы і іншых краін, па крупінках збіраем перадавы вопыт. А некаторыя нашы падыходы, методыкі потым распаўсюджваюцца на ўсю краіну і ў замежжы, — зазначае Людміла Кеда.

Дарэчы

«Арганізацыя добразычлівых адносін да дзіцяці» — такога статусу Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўдастоіла Гродзенскі перынатальны цэнтр за падтрымку прынцыпаў груднога выкормлівання, на якім там знаходзяцца амаль усе дзеці.

Дарэчы, Гродзенскі перынатальны цэнтр адным з першых у вобласці ўкараніў сістэму менеджмента якасці, якая дакладна рэгламентуе абавязкі кожнага работніка. Распрацавалі алгарытмы дзеянняў персаналу ў экстрэмальных сітуацыях.

Нясумная ідэалогія

— Мы надаём вялікую ўвагу ідэалагічнай рабоце, каб людзі ведалі, якая ў нас мэта і што трэба рабіць, каб дабіцца належнага выніку, — кажа Людміла Кеда. — Прычым, акцыі ў гэтым кірунку ладзім разам з нашымі пацыентамі.

Ужо традыцыйна ў перынатальным цэнтры віншуюць мам, чые дзеці нарадзіліся ў Дзень Незалежнасці Беларусі, а летась па ініцыятыве грамадскага аб'яднання «Белая Русь» з удзелам кіраўніцтва аблвыканкама і маладой сям'і яшчэ і заклалі Алею будучыні. Сёлета яна папоўнілася новымі дрэўцамі, аб чым паклапаціліся ў тым ліку і бацькі з дзецьмі, якія нарадзіліся 3 ліпеня ў 2014 і 2015 гадах.

Яшчэ адна «фішка» перынатальнага цэнтра — парад калясак у Дзень сям'і. Паўдзельнічаць у ім бацькоў запрашалі праз інтэрнэт, дзіцячыя садкі і ў выніку на парадзе было больш за 100 калясак з дзецьмі.

— Нават не чакалі, што будзе так прыгожа, — кажа пра мінулагоднюю акцыю Людміла Кеда.

— Прымусу не было?

— Не, гродзенцы — людзі вельмі творчыя, энергічныя і з вялізным задавальненнем адгукаюцца на наша запрашэнне. Трэба, мусіць, праводзіць яшчэ больш такіх цікавых акцый, каб яны маглі сябе праявіць.

Дарэчы, сёлета акцыю «Парад калясак» прадоўжылі ўжо на гарадскім узроўні — ён праходзіў у парку імя Жана Эмануэля Жылібера.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

■ Дапамога

ТАКОГА ПРАЕКТА ЯШЧЭ НЕ БЫЛО!

Сёння Беларусь усімі сіламі імкнецца дапамагчы Японіі справіцца з цяжкімі наступствамі тэхнагеннай катастрофы. Гэтым летам, у рамках шматгадовага дабрачыннага праекта дапамогі дзецям, якія пацярпелі ад радыяцыйнага выпраменьвання пры выбуху на Фукусімскай АЭС, з 21 ліпеня па 10 жніўня больш за сотню дзяцей і дарослых пройдуць санаторна-курортнае лячэнне ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня».

Фота БЕЛТА.

У жніўні 2012 года па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры была распрацавана спецыяльная рэабілітацыйная праграма. Менавіта тады 13 прадстаўнікоў з прэфектуры Міягі і прэфектуры Фукусіма — раёнаў, якія найбольш пацярпелі ў выніку выбуху энергаблока на АЭС «Фукусіма-1» — упершыню правялі канікулы ў «Зубраняці».

— Мы не маглі не адгукнуцца, бо ў 1986 годзе, калі адбыўся выбух на Чарнобыльскай АЭС, менавіта Японія першай аказала нам дапамогу, — гаворыць Надзея Ануфрыева, дырэктар НДЦ «Зубраня». — Але, на жаль, выпучыць сродкі з дзяржаўнага бюджэту на большую колькасць чалавек было цяжка. З 2015 года вялікую частку выдаткаў узяла на сябе кампанія «Гейм Стрым» і, дзякуючы такой падтрымцы, на гэты момант рэабілітацыйна-аздараўленчы курс у нашым цэнтры ўжо прайшлі больш за 250 японскіх дзетак.

Курс уключае поўнае медыцынскае абследаванне на базе Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы ў Бараўлянах. У дадатак — абследаванне спецыялістамі рухомай радыеметрычнай лабараторыі Пінскага пагранічнага атрада на магчымае перавышэнне дапушчальных узроўняў дозавай нагрузкі радыяцыі.

— Радыеметрычнае даследаванне, якое выконваецца з выкарыстаннем лічыльніка выпраменьванняў чалавека (ЛВЧ), неабходнае абсалютна для ўсіх, хто так ці інакш падвергнуўся ўздзеянню радыяцыі, — лічыць Аляксандр Ражко, дырэктар РНПЦ Радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека. — Сёння наша краіна валодае ўнікальным досведам у сферы радыяцыйнай медыцыны, сродкамі, неабходнымі для своечасовай дыягностыкі.

Даведка

Буйная радыяцыйная аварыя на АЭС Фукусіма-1 (па заяве японскіх афіцыйных асоб — 7-га ўзроўню па шкале INES) адбылася 11 сакавіка 2011 года ў выніку наймацнейшага ў гісторыі Японіі землятрусу і цунамі, якое абрушылася ўслед за ім. У спісы загінулых трапілі амаль 16 тыс. чалавек, дзясяткі тысяч пацярпелі.

Для кожнага з японскіх дзяцей, якія прыляцелі ў Беларусь на аздараўленне, курс рэабілітацыйных мерапрыемстваў распрацоўваецца выключна індывідуальна (кіслародны кактэйль, хвойна-жамчужныя ванны, аэраіонатэрапія, спелеатэрапія, механатэрапія, масаж і многае іншае).

Хадзукі Асіта прыехаў у Беларусь з горада Сендай. Пра тое, што Мінск і Сендай звязваюць дзясяткі гадоў сяброўства, узаемадапамогі і супрацоўніцтва, ён пачуў упершыню. А менавіта ж Сендай першым адгукнуўся і аказаў дапамогу беларусам пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У 1986-м беларусы атрымлівалі ў дар ад жыхароў Сендая і дыягнастычнае абсталяванне, і медыцынскія прэпараты, якія дапамаглі пераадолець наступствы аварыі. Сёння Беларусь усімі сіламі імкнецца дапамагчы Японіі справіцца з цяжкімі наступствамі тэхнагеннай катастрофы.

Сумаваць у «Зубраняці» забараняецца. Усмешкі тут паўсюды. Добры настрой усім без выключэння ўдзельнікам змены, незалежна ад нацыянальнасці, колеру вачэй, валасоў і ўзросту, ствараюць займальныя гульні, экскурсіі, сумесныя танцавальныя экспромты і майстар-класы на свежым паветры.

— Тут так весела! У мяне ўжо вельмі шмат беларускіх сяброў. Тут усе такія прыгожыя, шчырыя і добрыя. Усміхаюцца і кажуць: «Прывітанне!» У нас так не прынята, — дзеліцца ўражаннямі Міябі Сакамота.

На думку саміх дзяцей, Японія — дастаткова закрытая краіна, што абумоўлена перш за ўсё менталітэтам, нацыянальнымі асаблівасцямі і знешняй палітыкай дзяржавы. Аднак там гэты праект атрымаў шырокую вядомасць на самым высокім узроўні.

— Я прыляцела ў Беларусь для таго, каб асабіста падзякаваць за тую вялікую, неацэнную дапамогу, якая аказваецца ў рамках дабрачыннага спонсарскага праекта па аздараўленні дзяцей Японіі, — сказала член Палаты саветнікаў Парламента Японіі Масака Моры. — Падобнага праекта, мяркую, у гісторыі яшчэ не было. Для нас гэта сапраўды вялікі гонар.

Яна ЦЫДЗІК

Спадарыня Масака МОРЫ дзякуе за аказаную дапамогу.

■ Ведай нашых

ПЛЮС 8 УЗНАГАРОД У СКАРБОНКУ

Залаты і тры сярэбраныя медалі заваявалі беларускія школьнікі на 48-й Міжнароднай хімічнай алімпіядзе ў Тбілісі.

Усяго ўдзел у інтэлектуальных спаборніцтвах узялі 264 юныя хімікі з 76 краін свету. Міжнародная алімпіяда складаецца з двух тураў: эксперыментальнага і тэарэтычнага. Абодва доўжацца да 5 гадзін і праводзяцца ў розныя дні. Кожную краіну прадстаўляе каманда, якая складаецца не больш чым з чатырох чалавек.

У беларускай камандзе без узнагарод не застаўся ніхто. Выхаванец сталічнай гімназіі №13 Канстанцін Анісовіч атрымаў залаты медаль. Сярэбраныя медалі — у ліцэістаў БДУ Рамана Ларковіча, Рыгора Сіненкі і прадстаўніка сярэдняй школы №47 горада Мінска Міраслава Макарэвіча.

З медалямі вярнуліся беларускія школьнікі і з Ханоя (В'етнам), дзе праходзіла 27-я міжнародная алімпіяда па біялогіі. Адзінаццацікласнік Ліцэя БДУ Альберт Вайшэвіч атрымаў «серабро». А Дзяніс Яроцкі, Паліна Трус (абодва з Ліцэя БДУ) і Ганна Галькевіч са сталічнай гімназіі №12 былі ўдастоены бронзавых узнагарод.

Трэба патлумачыць, што залатыя медалі даюцца на міжнародных спаборніцтвах лепшым

10% удзельнікаў, сярэбраныя — наступным 20% удзельнікаў і бронзавыя медалі — наступным 30% удзельнікаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Ну і ну!

Каб не плаціць, выйшаў з лазні... цераз акно

Маладая пара прыйшла ў лазневы комплекс, што ў Першамайскім раёне сталіцы. Аплаціўшы ўваходны білет, хлопец і дзяўчына атрымалі спецыяльныя бранзалеты з датчыкамі, з дапамогай якіх можна было скарыстацца паслугамі бара на суму 40 дэнамінаваных рублёў, а пры выхадзе аплаціць суму, якая налічыцца датчыкам.

Наведвальнікі знаходзіліся ў комплексе каля дзвюх гадзін, скарыстаўшыся і паслугамі бара. Папарыўшыся, яны накіраваліся ў купальню. У яе памяшканні малады чалавек цераз акно пакінуў комплекс, выкраўшы бранзалет. Праз некаторы час дзяўчына накіравалася да выхаду. Аддаўшы свой бранзалет, яна сказала, што малады чалавек вырашыў яшчэ трохі адпачыць і выйдзе пазней, расказалі ў Першамайскім РУУС г. Мінска.

Убачыўшы адкрытае акно, ахоўнік западозрыў нядобрае і накіраваўся ў купальню. Прагледзеўшы запісы з камер відэаназірання, ён звярнуўся ў міліцыю. Заказ коштам 38 рублёў 69 капеек быў не аплачаны, таксама быў выкрадзены дарагі бранзалет. Падазраваных — юнака і дзяўчыну на выгляд 16-20 гадоў — цяпер шукаюць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

У нашу краіну дастаўлены мошчы святога-лекара

У Нацыянальны аэрапорт Мінск з Італіі 1 жніўня прыбыла праваслаўная святыня — перадплечча святога велікамучаніка, лекара і цудатворца Панцеляймона.

Як паведамляе карэспандэнт БЕЛТА, упершыню за 350 гадоў каўчэг з мошчамі і святыня пакінулі месца свайго знаходжання — кафедральны сабор у горадзе Джэрачы (Калабрыя, Італія). Усе неабходныя мытныя працэдуры былі праведзены карэктна, без затрымкі часу, адзначылі ў прэс-групе. На выхадзе з зоны мытнага кантролю святыню сустракалі дзясяткі праваслаўных вернікаў.

Каўчэг дастаўлены ў Свята-Петра-Паўлаўскі кафедральны сабор у Гомелі, дзе і будзе знаходзіцца да 12 жніўня, а затым зноў адправіцца на гістарычную радзіму.

Святы Панцеляймон быў замучаны за хрысціянскую веру ў Нікамедыі (рэгіён сучаснай Турцыі) у 305 годзе. У Паўднёвай Італіі знаходзяцца некалькі часцінак мошчаў мучаніка. Ампулы з крывёй святога знаходзяцца ў саборах і цэрквах, размешчаных у розных рэгіёнах Італіі.

Боепрыпасы на мяжы

Вайна ўсё яшчэ агрызаецца праржавелымі смяротнымі цацкамі. Вось і нядаўна вада Заходняга Буга вымыла з грунту не да канца прагніўшую драўляную скрыню, поўную боепрыпасаў.

Як паведаміў **кіраўнік прэс-службы Брэсцкай памежнай групы Аляксандр КІСЛОЎ**, падазроны прадмет, што вытыркае з зямлі, заўважылі вайскоўцы заставы імя Кіжаватава, якія патрулявалі мяжу на катары каля вострава Пагранічны. Супрацоўнікі сапёрна-піратэхнічнай службы, якія прыбылі па выкліку, вынялі боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны і вывезлі небяспечную знаходку на падрыўную пляцоўку.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Хлопцы і дзяўчаты танулі па адным «сцэнарыі»

Амаль а сёмай гадзіне раніцы пры кантролі абстаноўкі на акваторыі Цнянскага вадасховішча ў сталіцы работнік цэнтра вадалазна-выратавальнай службы ўбачыў за 250—300 метрах ад берага двух чалавек, якія танулі і прасілі аб дапамозе. Глыбіня ў гэтым месцы была каля 5 метраў.

Да месца здарэння быў накіраваны катар «Прагрэс-2М» з аддзяленнем Цэнтра вадалазна-выратавальнай службы. У выніку работнікамі МНС былі выратаваны два маладыя чалавекі 1997 года нараджэння. Абодва знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення, атрымалі пераахаладжэнне арганізма. Пасля аказання дапамогі (абагравание, гарачае пітво) адпушчаныя дадому. У медыцынскай дапамозе патрэбы не мелі.

Суткамі раней падобнае надзвычайнае здарэнне адбылося на пляжы №2 гэтага ж Цнянскага вадасховішча, нагадалі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС. А палове дзявятай гадзіны вечара за 70 метраў ад берага пачалі тануць дзве дзяўчыны. Мінчанак, якім было 22 і 28 гадоў адпаведна, аператыўна выратавалі супрацоўнікі АСВОДа. Пацярпелых шпіталізавалі ў медыцынскія ўстановы з дыягназам «стан пасля ўтаплення, алкагольнае ап'яненне».

МНС чарговы раз нагадвае: алкаголь — асноўная прычына гібелі на вадзе! Купацца пасля распіцця спіртнога катэгарычна забараняецца. Таксама нельга нырэць і скакаць у ваду ў незнаёмых месцах і дазваляць плаваць дзецям без нагляду дарослых.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЛЯТАЮЧАЯ ПАГРОЗА

Як ухіліцца ад атакі?

Болей за іншых джаланосных насякомых на тэрыторыі Беларусі распаўсюджаны восы. Ёсць некаторыя прафілактычныя захады, якія дапамогуць зменшыць верагоднасць непажаданага рандэву з патэнцыйным агрэсарам.

— Папяровыя восы ўяўляюць небяспеку толькі ў непасрэднай блізкасці ад гнязда, — працягвае Віталь Дэмбоўскі. — Адзінкавыя восы карыстаюцца джалам дзеля абароны ад чалавека і першымі атакуюць рэдка. Менавіта таму трэба быць максімальна асцярожным у тых месцах, дзе могуць пасяліцца небяспечныя насякомыя. Гэта расліннасць, якая цвіце, і месцы ападу садавіны. Калі вы ўбачылі гняздо, то да яго ні ў якім разе набліжацца не трэба.

Восы валодаюць дрэнным слыхам, але да вібрацыі цвёрдага цела яны вельмі адчувальныя. Таксама трэба быць гатовым да няпрошаных гасцей жоўта-чорнага колеру, калі вы робіце варэнне ці п'яце на вуліцы фруктовыя сокі. Цікава, што восы найбольш «любяць» жоўты колер. Таму не варта пры рабоце на прысядзібным участку апранаць яркую вопратку. Насякомыя таксама вельмі адчувальныя да арганічных рэчываў з групы складаных эфіраў і спіртаў, якія масава ўжываюцца ў парфумернай прамысловасці. Таму духамі і адэкалонам у гэты час трэба карыстацца максімальна асцярожна.

А што рабіць, калі рой вос абысці далёка ніяк не атрымліваецца? У такім выпадку лепш прыкрыць цела па максімуму. А галаўны ўбор проста незаменны. Трэба таксама ўважліва сачыць за тым, што вы ясце. Здараліся выпадкі, калі людзі незнарок разам са слівай ці чарэшняй адпраўлялі ў рот і асу, якая сядзела на фрукце. Насякомае джаліла ў слізістую абалонку, што імгненна прыводзіла да ацёку тканак і асфіксіі.

А калі вы незнарок патрывожылі гняздо з восамі, застаецца толькі адно: тут жа прыкрыць чымсьці галаву і зараз жа даваць драла. Марудзіць ні ў якім разе нельга: шматлікія ўкусы могуць выклікаць анафілактычны шок, які за лічаныя хвіліны прывядзе да смерці.

Аперацыя «Ліквідацыя»

Знайсці і выдаліць гняздо — найлепшы спосаб барацьбы з імі. Няма насякомых — няма і праблем. Але перш чым адпраўляцца на гэтую справу, трэба сур'ёзна падрыхтавацца. Экіпіроўка мусіць быць такой, каб не засталося ніводнага адкрытага ўчастка цела. Для гэтага лепш за ўсё падыдуць касцюм са шчыльнай тканіны, трывалыя пальчаткі і гумавыя боты. Галаву лепш абараніць двума «бар'ерамі» — кепкай, а наверх яе апрануць капялюш пчаляра з абарончай сеткай.

— Прыбіраць гнёзды лепш за ўсё глыбокай ноччу, — раіць Віталь Дэмбоўскі. — У гэты час усе восы сям'і знаходзяцца там. Менавіта таму верагоднасць падвергнуцца атацы насякомых, якія лётаюць на здабычу ежы, мінімальная. Паколькі ў гняздзе, як правіла, уваход толькі адзін, то задачу моцна облегчыць класічны атрутны аэразоль кшталту «Дыхлафоса». Трэба ўзяць поліэтыленавы пакет, які па памерах перавышае гняздо, напоўніць яго аэразолем аб'ёмам 150—200 мілілітраў, надзець на гняздо і як мага больш шчыльна прыціснуць да яго сценак. Калі гудзенне сціхне, праз некалькі хвілін зрэзаць гняздо вострым нажом і закапаць у зямлі.

Першая дапамога

— Шэршні лічацца самымі небяспечнымі з тых насякомых, якія існуюць на тэрыторыі Беларусі, — гаворыць Віталь Дэмбоўскі. — Таксічная рэакцыя ў чалавека ўзнікае, калі яго адначасова ўджаляць некалькі насякомых. Адзначаліся выпадкі, калі да смерці прыводзіў усяго адзін ці два ўкусы. Гэта звязана з тым, што шэршань уводзіць пры джаленні вельмі вялікую порцыю атруты. Прычым трапіць на гняздо шэршняў неспадзявана можна нават у лесе: гэтыя насякомыя робяць гнёзды ў зямлі.

Навукоўцы адзначылі, што да атруты больш успрымальныя жанчыны і дзеці. Цікава, што алергічная рэакцыя на атруту ўзнікае ў 1-2% людзей незалежна ад таго, колькі перапончатакрылых іх уджаліла — адно ці некалькі. Яна ўзнікае вельмі хутка. Яе прыкметы — моцны ацёк, павышэнне тэмпературы, галаўны боль, ваніты, бледнасць. У такім разе неабходна як мага хутчэй даць пацярпеламу антыгістамінны сродак і тут жа тэлефанаваць па нумары 103.

Пры ўкусе нельга душыць насякомае, якое ўджаліла вас. Пры смерці або раненні яны вылучаюць рэчывы, якія прыводзяць рой у агрэсіўны стан. Калі побач знаходзіцца вялікая колькасць падобных насякомых або гняздо, вы можаце зазнаць масавую атаку. Нельга таксама і расціраць месца ўкусу. Гэтым вы толькі пагоршыце становішча, распаўсюджваючы атруту ў суседнія тканкі. Таму нельга і націскаць на месца ўкусу, спрабуючы выняць джала. Рабіць гэта можна толькі пінцэтам. Калі гэта зрабіць не ўдалося, трэба звярнуцца да ўрача. Таксама трэба прадэзынфіцыраваць месца ўкусу. Зняць боль дапаможа чайная лыжка солі, разведзеная ў шклянцы вады. Боль ад укусу і ацёк трымаюцца звычайна да 4 гадзін, але могуць захоўвацца і на наступны дзень. Калі і за гэты час ацёк не знік, трэба ісці да дактароў...

Не ўсё так дрэнна?

Зрэшты, трэба сказаць некалькі слоў і ў абарону вос. Яны харчуюцца лічынкамі, вусенямі, насякомымі і дзякуючы гэтаму моцна зніжаюць колькасць шматлікіх шкоднікаў у садзе. У адрозненне ад пчалы, яны джаляць толькі тады, калі бачаць у чалавеку пагрозу. Менавіта таму, калі гняздо вос знаходзіцца даволі далёка ад месцаў магчымага кантакту з чалавекам, яго пажадана захаваць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.